# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАДСТАВЫ БЕЛАРУСКАГА ПОСТАВАНГАРДУ

**Лень Юлія Аляксандраўна**

Поставангард – саманазва неаднастайнай па сваім саставе і эстэтычных імкненнях плыні ў Актуальным беларускім мастацтве. Пры сваёй разнастайнасці і нават супярэчлівасці беларускі авангард мае пэўныя агульныя канцэптуальныя падставы.

Генэзіс беларускага поставангарду безумоўна трэба шукаць у “класічным” еўрапейскім авангардзе. Філасофская база беларускага поставангарду шмат у чым супадае з ідэйнай платформай “класічнага” еўрапейскага авангарду, напрыклад, у спасылках на посткласічную філасофію. Беларускі поставангард сапраўды блізкі да еўрапейскага авангарду з яго пафасам татальнай негацыі. Авангард і поставангард характэрызуюцца візіянерствам і эсхаталагічнасцю. Авангардыстам неабходна выпрацоўваць канцэптуальную базу, якая ядлюстроўваецца ў тым ліку і ў маніфестах. Эстэтыка групы “Schmerzwerk” па сваіх інтэнцыях падобна да дадаістаў з іх імкненнем да дэструкцыі і татальнага ірацыяналізму. Выклікам да бунту супраць аніякай нормы прасякнуты своеасаблівы маніфест аўтсайдэрскага мастацтва В. Мартыненка “Аўтсайдэр-арт” [1].

Сярод аўтарытэтных уплываў на беларускі поставангард можна назваць постструктуралізм і тэатр абсурду. Сінтэтызм канцэптуалізму (спалучэнне навукова-тэхнічных дасягненняў, філасофіі і мастацтва) адлюстраваўся і ў беларускім варыянце поставангарду. Асабліва гэта бачна ў спецыфічных дзеяннях-перформансах, мэтай якіх з’яўляецца цялеснае ўвасабленне філасофскіх ідэй. Невыпадкова многія з дзеячаў “бум-бам-літа” і групы “Schmerzwerk” выступаюць не толькі ў мастацкім амплуа, але займаюцца навуковай дзейнасцю ў галіне літаратура- і мастацтвазнаўства, філасофіі.

Такім чынам, рэфлексія прысутнічае ў беларускім поставангардзе на двух узроўнях:

1. На ўзроўні канкрэтнага арт-праекту, сканцэнтраванага на працэсе яго стварэння і функцыянавання ў прасторава-часавым канцінуўме.
2. На ўзроўні самаасэнсавання і самаўсведамлення ў форме навукова-філасоўскага аналіза сваёй (і не толькі) арт-дзейнасці наогул.

Абсурд (якія займае асаблівае месца ў авангардысцкім светапоглядзе і эстэтыцы) прымае тут спецыфічную форму. Дзеянні, знешне абсурдныя з пункту гледжання звычайнага мыслення, набываюць сэнс, ідэю, якія ўсведамляюцца толькі ў кантэксце таго, што адбываецца тут і зараз. Іншымі словамі, абсурд вызначаецца тут не як абсалют, аднак як кантэкстуальная сэнсатворчасць.

Рэзкі разрыў з традыцыяналізмам, з аднаго боку, і апеляцыя да авангарду першай хвалі, з другога, абумоўлівае іх “пост”-пазіцыю. А таму бунтарскі разрыў з мінулым азначае хутчэй не адмаўленне ад усяго, што было дагэтуль, але адмову застылым формам, якія буксуюць свабоднае развіццё мастацкай культуры. Палемічнасць і дыялагізм (якія скіраваны як

па гарызанталі, так і па вертыкалі культурнай прасторы) надаюць поставангарду блізкасць да постмадэрнісцкай мастацкай мадэлі.

Менавіта беларускі варыянт поставангарду вылучае спалучэнне вышэй акрэсленых канцэпцый з традыцыйным для "тутэйшых" пошукам нацыянальнага твару мастацтва, імкненнем знайсці нейкія гістарычныя (або міфічныя) карані нацыянальнага самавызначэння. Мабыць, таму ў работах некаторых тэарэтыкаў Актуальнага мастацтва (напрыклад, Ю. Барысевіча) гучыць часам песімізм, расчараванне ў сучаснасці. Адсюль ідзе і нявызначаная настальгія, смутак, ці то па савецкіх часах, ці то па першабытнасці: "Цэнзура ў таталітарным грамадзтве й табу ў першабытным забараняюць многія слава і ўчынкі, але садзейнічаюць узбагачэнню астатніх новымі сэнсамі, надаюць словам і жэстам дадатковую глыбіню й сымболіку" [2, С. 7]. Балючы пошук кропкі адліку самавызначэння таксама выкліканы тым, што Беларусь стала незалежнай менавіта ў час глабалізацыі. Можна сказаць, што глабалізацыйныя працэсы сталі для нацыянальных (у тым ліку беларускай) культур выклікам, бо ў свеце, які імкнецца да ўніфікацыі, ўдвая складана не страціць унікальнасць і зацвердзіцца ў ёй. Ю. Барысевіч (падобна да Ж. Бадрыяра) крытыкуе масавую культуру, культуру сімулякраў.

Творчасць многіх шмэрцверкаўцаў прасякнута пошукам нацыянальнай ідэі, самаідэнтыфікацыі. Гэта збліжае іх з прадстаўнікамі нацыянальнага адраджэння пачатку XX стагоддзя, мэтай якіх было абуджэнне цікавасці да нацыянальнай культуры сярод народу. Нават графічнае афармленне іх літаратурна-мастацкага праекту "Тэксты" – на вокладцы мы бачым адбітак далоні, дактыласкапію – сімвалізуе ўнікальнасць і непаўторнасць іх Аўтараў.

Літаратура:

1. *Мартыненка, В.* Аўтсайдэр-арт / В. Мартыненка // Тэксты. № 6. 2008. С.4–6.

2. *Барысевіч, Ю.* Alter nemo / Ю. Барысевіч. СПб., 2002.